Фотавыстаўкі пра Беларусь і Расію адкрыліся ў Кішынёве, піша БелТА. Пры падтрымцы пасольстваў Беларусі і Расіі беларуская і руская дыяспары Малдовы арганізавалі тэматычныя фотаэкспазіцыі, прысвечаныя Дню яднання народаў Беларусі і Расіі. Фотавыстаўка Нацыянальнай бібліятэкі «Беларусь — цудоўныя імгненні» прадстаўлена ў Расійскім цэнтры навукі і культуры. У Беларускім культурным цэнтры адкрылася выстаўка фатаграфій «У аб'ектыве — шматнацыянальная Расія». З нагоды свята пасольства Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Малдова перадало ў дар Рускаму дому ў Кішынёве кнігі пра Беларусь. Акрамя таго, была падрыхтавана музычная праграма — народная артыстка Малдовы Маргарыта Івануш выканала вакальныя творы на тэму патрыятызму і любові да сваёй Радзімы. На адкрыцці выставак прысутнічалі прадстаўнікі беларускай і расійскай дыпламатычных місій, нацыянальных дыяспар Беларусі і Расіі ў Малдове, дзеячы культуры.